*Зайцев В. В.* О новых находках смоленских монет начала XV в. в России // Другія Навуковыя чытанні памяці прафесара Валянціна Навумавіча Рабцэвіча (1934–2008). 26–28 лістапада 2014 года. Мінск–Нясвіж, 2014. С. 32–33.

*Зайцев В. В.* О времени чеканки смоленских монет с изображением колюмн и Ю-образного знака // Русские монеты XIV–XVII вв. Очерки по нумизматике. М., 2016. С. 92–106.

**С. М. Крыстэсіашвілі**
*Мінск, Беларусь*

# КОМПЛЕКС РАННЕЛІТОЎСКІХ МАНЕТ З МАЛАДЗЕЧАНСКАГА РАЁНА СА ЗБОРУ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У 2015 г. на лясной дарозе каля в. Капáчы Маладзечанскага раёна быў знойдзены скарб манет XIV ст., які паступіў у Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, дзе захоўваецца пад інвентарным нумарам КП 53354.

Дэпазіт складаецца з 12 раннелітоўскіх манет, з якіх 10 экзэмпляраў маюць адносна добрую захаванасць. Адна манета (верагодна, з падвойным крыжам?) вельмі моцна зацёртая, а яшчэ адна захавалася ў выглядзе дробнага абломка і не паддаецца атрыбуцыі. Ніжэй падаецца апісанне дзесяці манет добрай захаванасці, якія падзяляюцца па трох тыпах.

Адна манета (вагай у 0,94 г. і дыяметрам у 15 мм) належыць да тыпу «Леў → / Наследаванне арабскай легендзе» (Гулецкий, 2014, № 3).

Дзве манеты належаць да тыпу «Падвойны крыж у тарчы / Леў →» (Гулецкий, 2014, № 32). На адваротным баку манет змешчана імітаванне кірылічнага ці лацінскага надпісу. Вага гэтых манет – 0,57 і 0,39 г, памеры – 13×14 і 12×13 мм.

Сем манет належаць да тыпу «Леў / Партрэт». На пяці з іх леў накіраваны ў правы бок (Гулецкий, 2014, № 9), а на дзвюх– у левы (Гулецкий, 2014, № 10). Метрычныя характарыстыкі гэтых манет, некаторыя з якіх захаваліся часткова, наступныя: вага – 0,44, 0,81, 0,54, 0,39, 0,89, 0,80 і 0,26 г; памеры – 12,5×15, 16×16,5, 14×15, 11×13, 14×15, 14×15, 7,5×13 мм. На трох манетах фрагментарна прасочваецца надпіс «MAGNA REGINA».

## Спіс літаратуры

*Гулецкий Д. В.* Монеты Великого Княжества Литовского (со второй половины 14-го века до 1536 года). Минск, 2014.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm